# Фестываль нефармальнай адукацыі 2008 працяг будзе



Улад Вялічка

Адной з ключавых падзей гэтага года ў сферы адукацыі дарослых безумоўна можна лічыць II Фестываль нефармальнай адукацыі, які прайшоў у Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры ім. Йаханэса Рау 10–12 кастрычніка 2008 года. Другі Фестываль праводзіць заўсёды нашмат цяжэй, чым першы, бо многія чакаюць якаснага росту, выпраўлення памылак, пры гэтым вонкавыя ўмовы для працы ў адукацыйнай сферы за апошнія два гады хутчэй пагоршыліся, чым дазволілі атрымаць новыя магчымасці для развіцця.

Нягледзячы на ўсё гэта, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што другі Фестываль атрымаўся на парадак лепш за першы, дазволіўшы аб'яднаць на працягу трох дзён працы людзей з больш за 90 беларускіх арганізацый, а таксама калегаў з шэрагу еўрапейскіх краін (Германія, Швецыя, Данія, Украіна, Расія, Польшча). Пра паспяховасць Фестывалю ў розны час выказваліся практычна ўсе яго ўдзельнікі, арганізатары і госці, якіх у агульнай колькасці было каля 350 чалавек.

Фестываль прайшоў на высокім арганізацыйным узроўні і шмат у чым задаў планку на будучыню. Яго паспяховасць была забяспечана трыма асноўнымі фактарамі: па-першае, гэта вельмі вялікая праца, выкананая на працягу некалькіх месяцаў аргкамітэтам і тэхнічнай групай. Па-другое, высокі ўзровень зацікаўленасці саміх удзельнікаў і іх вялікі ўнёсак у праграму і ўтрыманне Фестывалю (майстар-класы, прэзентацыі выданняў, выстава і інш.). Па-трэцяе, не рэалізаванае да гэтага ў поўнай меры жаданне шырокага кола беларускіх адукатараў выйсці на якасна новы ўзровень абмену досведам, прафесійнай камунікацыі, прадастаўлення сваіх адукацыйных паслуг.

Адметнай асаблівасцю дадзенага Фестывалю было імкненне арганізацый "прарвацца" са сваімі адукацыйнымі прапановамі да шырэйшага круга беларускіх грамадзян. Прысутнасць у праграме майстар-класаў і прэзентацый дазволіла ўбачыць самабытнасць і разнастайнасць адукацыйных арганізацый і вынікаў іх працы.

## Уражанні ад Фестывалю

**Марына Шорэц,**
кансалтынгавая кампанія "Шорец и Ко"

Я после Фестиваля до сих пор не могу реализовать все те идеи, которые меня посетили. Очень вдохновляющее событие. Хочу отметить сильные стороны данного события:

- Профессиональные докладчики, которые рассказали о результатах своей работы. У ведущих мастер–классов мне как профессионалу было чему поучиться.
- Большое разнообразие представленных работ. Это дает огромный толчек в собственной работе.

Самое яркое событие Фестиваля для меня — это круглые столы и мастер–классы.

Круглые столы — это возможность высказаться, лучше понять друг друга. Что касается мастер–классов, то ведущие работали с такой отдачей, что 4 в день для меня было даже много.

На самом деле, мне очень понравилось. Все отлично — даже трудно сказать, что можно улучшить. Можно уменьшить количество мастер–классов.

Может быть, ввести какие–то дополнительные услуги (фото на память).

Вельмі важным фактарам з'явілася тое, што Фестываль быў міжнародным. Калегі з еўрапейскіх краін мелі магчымасць за кароткі тэрмін пазнаёміцца з вялікай колькасцю арганізацый і іх дзейнасцю, а таксама з тымі праблемамі, якія не даюць спакойна спаць беларускім адукатарам. Замежныя партнёры адзначылі, што некаторыя з гэтых праблем з'яўляюцца спецыфічнымі, аднак большасць з іх характэрна ў той жа ступені і для адукацыйнай сферы іх краін. Вельмі пазітыўная ацэнка і водгукі з боку замежных гасцей Фестывалю сведчаць таксама, што арганізатарам удалося прадставіць беларускую нефармальную адукацыю як жывую і актыўную сферу дзейнасці, што дазваляе разлічваць на развіццё новых міжнародных кантактаў і супрацоўніцтва.

У адрозненне ад першага Фестывалю, у дадзеным выпадку арганізатары змаглі забяспечыць удзел у гэтай падзеі гульцоў з розных сектароў – у прыватнасці прадстаўнікоў бізнес-адукацыі, дзяржаўных вучэбных устаноў, а таксама структур канфесійнай адукацыі.

Асобнай увагі заслугоўвае інфармацыйнае суправаджэнне і праца па сувязях з грамадскасцю, праведзеныя напярэдадні, пад час працы і па выніках Фестывалю. У адрозненне ад першага Фестывалю, у дадзеным выпадку партнёры змаглі забяспечыць максімальна магчымы шырокі PR і самой падзеі і яе вынікам. Свае нататкі і артыкулы пра Фестываль прадставілі ў розны час больш за 30 электронных і друкаваных выданняў, якія асвятляюць розныя аспекты грамадскага жыцця Беларусі.

Калі казаць пра больш пэўныя практычныя ўрокі, атрыманыя ініцыятарамі Фестывалю нефармальнай адукацыі, то сярод іх варта адзначыць наступнае:



## Уражанні ад Фестывалю

### Яніна Зінчанка,
сябра аргкамітэта па падрыхтоўцы Фестывалю

В оргкомитете участвую впервые, поэтому мероприятие такого масштаба мне интересно само по себе. Кроме того, это хороший опыт.

Думаю, что первоочередной целью любого фестиваля является демонстрация каких-то достижений, в нашем случае в сфере неформального образования. В общем и целом эту задачу Фестиваль выполнил. Наверное, для решения проблем не следует полагаться на формат фестиваля, так как это мероприятие масштабное и участвуют в нем люди разного уровня подготовки и профессионализма.

Мне кажется, что как команда оргкомитет сработал хорошо, своевременно и адекватно реагируя на различные изменения программы по ходу действия.

На мой взгляд, в будущем можно было бы ограничиться двумя днями, изменив тем самым содержательную часть. В этой связи мои замечания и пожелания можно было бы разделить на две группы: "сильные стороны" (то, что удалось и стоит сохранять и развивать дальше) и "стоит подумать" (предложения на будущее, так как опыт показал, что в этой области есть проблемы).

**Сильные стороны:**

- участие в подготовке и проведении представителей различных организаций;
- участие представителей бизнес-сектора, в том числе в программе фестиваля;
- удачный формат проведения презентаций и мастер-классов, который обеспечивает презентабельность методов и способов работы в неформальном образовании;
- хорошо продуманная вечерняя программа, особенно мастер-класс по танцам;
- участие зарубежных гостей.

**Стоит подумать:**

- Возможно, два дня вместо трех было бы достаточно.
- Стоит ли проводить конкурс изданий, или достаточно провести выставку книг и журналов с презентациями, встречи с авторами?
- Перевести круглые столы в разряд конференции (установочные доклады, секции), где бы проходило представление докладов и их обсуждение. Формировать секции по тематике и, возможно, увеличить их количество. Отказаться от круглых столов, которые носят ту же содержательную нагрузку, что и секции, и установочные доклады.
- Возможно, создание веб-страницы могло бы снять некоторые трудности (например, программа, заявка и т.п.).
- Для чего и в каком качестве нам нужен государственный сектор на Фестивале (гости, эксперты, со-организаторы)?




- Відавочным узмацненнем дадзенай падзеі сталі ўдалыя спробы яго арганізатараў пашырыць рамкі і арганізаваць дыялог паміж рознымі сектарамі, якія рэалізуюць праграмы і праекты ў нефармальнай адукацыі.

- У найбольшай ступені Фестываль атрымаўся менавіта фестывалем дзякуючы добрай арганізацыі яго нефармальнай часткі. Госці форуму змаглі прыняць удзел у адкрытым майстар-класе па танцах народаў свету, сустрэцца і пагутарыць з рэдактарамі і аўтарамі вядучых беларускіх часопісаў сферы культуры, пазнаёміцца з рарытэтнымі выданнямі з фондаў Навукова-педагагічнай бібліятэкі і да т.п. У значнай ступені мерапрыемствы гэтай часткі праграмы сталі своеасаблівым “ноу-хау” Фестывалю.

- Удзел замежных гасцей у Фестывалі сёлета быў на парадак лепшым і якасным дзякуючы больш актыўнай прапрацоўцы іх ролі і магчымасцей быць уключанымі ў працу. Акрамя таго, шмат хто з удзельнікаў прыехаў у Мінск з пэўнымі ідэямі супрацоўніцтва, што дапамагло выкарыстаць Фестываль у максімальнай ступені для планавання новых партнёрскіх праектаў і праграм.

- Як ужо адзначалася вышэй, прынцыпова па-іншаму была арганізавана праца па сувязях з грамадскасцю, што дазволіла шырока праінфармаваць грамадзян краіны, адмыслоўцаў, зацікаўленыя арганізацыі аб Фестывалі і яго выніках. Сёлета як ніколі адчувалася жывая цікавасць да гэтай падзеі з боку навінавых выданняў, адукацыйных выданняў, агульна-папулярных газет, часопісаў і электронных СМІ.

- Асобна хацелася б адзначыць удалы досвед супрацоўніцтва аргкамітэта Фестывалю з ініцыятарамі кампаніі “**Будзьма!**” у рамках правядзення конкурсу на лепшы стэнд. Гэта стала добрым прыкладам таго, як менавіта супрацоўніцтва розных грамадскіх груп і каманд дазваляе дасягаць сінэргетычнага эфекту і дэманстраваць рэальную і прадуктыўную салідарнасць і кааператыўнасць у трэцім сектары.

## Уражанні ад Фестывалю

**Лана Руднік,**
ГА “Цэнтр «Трэці сектар»”,
Гродна, сябра аргкамітэта
па падрыхтоўцы Фестывалю

Другі Фестываль нефармальнай адукацыі пакінуў у мяне супярэчлівыя ўражанні. З аднаго боку, як і ў 2006 г., была створана добрая пляцоўка для абмену досведам, абмеркавання актуальных пытанняў, прэзентацыі дзейнасці арганізацый, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы. Тыя, хто займаюцца нефармальнай адукацыяй, пацвердзяць, што вельмі мала магчымасцяў сустракацца, знаёміцца і абмяркоўваць важныя пытанні. У параўнанні з I Фестывалем, павялічылася колькасць прадстаўленых арганізацый, больш было прэзентавана цікавых і новых праграм, тэм, выданняў. Гэта сведчыць не толькі пра прафесійныя і творчыя здольнасці адукатараў, але і пра жаданне прадстаўляць якасныя прадукты шырокаму колу грамадскасці.

Заўважна было, што II Фестываль быў больш якасна арганізаваны — пачынаючы ад сістэмы інфармавання і сканчаючы ўмовамі для пражывання.

З іншага боку, частка выступаў на пленарных паседжаннях і прэзентацыях падалася манатоннай і нецікавай. Нестандартных, яркіх, сапраўды фестывальных прэзентацый было мала. Круглыя сталы з цікава агучанымі тэмамі не давалі вынікаў у выглядзе канкрэтных, узгодненых прапаноў (яўна бракавала адведзенага на іх правядзенне часу). Больш магло б быць замежных гасцей, асабліва з суседніх краін. Больш магло б быць беларускага на БЕЛАРУСКІМ ФЕСТЫВАЛІ нефармальнай адукацыі.

Непрыемна ўразіла часам агрэсіўнае стаўленне некаторых удзельнікаў Фестывалю адно да аднаго. Выразы кшталту: **“Раз Вы так лічыце, то Вы наш ідэалагічны вораг. І Вы так лічыце? Яшчэ адзін ідэалагічны вораг!”** у дачыненні да калегаў па грамадскаму сектару ну ніяк не рабілі атмасферу мерапрыемства больш святочнай. Як тут не пагадзіцца з выказваннем аднаго з удзельнікаў Фестывалю адносна таго, што перад тым як патрабаваць прызнання нас з боку дзяржавы, варта навучыцца прызнаваць адно аднаго!

Наіўна было б спадзявацца, што пасля сканчэння Фестывалю пытанне прызнання нефармальнай адукацыі з боку дзяржавы будзе вырашаным, зменіцца стаўленне да арганізацый, павысіцца колькасць і якасць паслугаў у гэтай сферы.

У гэтым кірунку яшчэ шмат працы ва ўсіх суб’ектаў нефармальнай адукацыі. Напэўна, спатрэбіцца яшчэ не адзін фестываль і іншыя механізмы, якія дазволяць папулярызаваць пытанні нефармальнай адукацыі. Вось толькі пра іх будучы фармат трэба задумацца ўжо зараз. З майго пункта гледжання, на Фестывалі трэба найперш…ФЕСТЫВАЛІЦЬ: рабіць з яго яркую, прываблівую, запамінальную, лёгкую імпрэзу з вялікай колькасцю цікавых прэзентацый, выступаў, творчых сустрэч, ток–шоу і г.д. Абмеркаванне канцэптуальных пытанняў трэба выносіць на адмысловыя круглыя сталы, канферэнцыі і г.д., больш старанна рыхтаваць іх праграму, запрашаць спецыяльных экспертаў і падрыхтаваных да дыскусіі ўдзельнікаў…

З негатыўных урокаў трэба спыніцца на наступным:

- На жаль, у чарговы раз падрыхтоўчая фаза Фестывалю прыйшлася на летні перыяд, што істотна ўскладніла працу Аргкамітэта па падрыхтоўцы Фестывалю. На момант пачатку верасня было атрымана крытычна мала заявак ад удзельнікаў. Сітуацыя была выпраўлена толькі дзякуючы пра-актыўнай інфармацыйнай кампаніі і наяўнасці дадатковага часу з-за пераносу Фестывалю на месяц пазней.
- У апошнія некалькі гадоў сярод лідэраў грамадскіх арганізацый назіраецца крайняя перагружанасць, у сілу чаго многія з тых, на дапамогу каго разлічвалі арганізатары, апынуліся не ў стане знайсці досыць часу для ўдзелу ў падрыхтоўцы Фестывалю. Гэты факт носіць характар тэндэнцыі і істотна ўскладняе падрыхтоўку падобнага роду мерапрыемстваў.
- Як і ў рамках першага Фестывалю, у дадзеным выпадку не атрымалася ў поўнай меры выкарыстаць працу ў секцыях і круглых сталах для істотнага падвышэння планкі дыскусіі на Фестывалі. Нягледзячы на вельмі якасныя пленарныя даклады, іншыя групавыя формы працы спрацавалі часткова і не дазволілі дасягнуць чаканай глыбіні дыскусій удзельнікаў. Хоць, магчыма, такога кшталту задачы павінны вырашацца ў рамках іншага роду мерапрыемстваў. Аб гэтым казалі ўдзельнікі Фестывалю пры закрыцці мерапрыемства і падвядзенні яго вынікаў.

## Уражанні ад Фестывалю

### Алена Радзевіч,

каардынатар адукацыйных праграм, міжнародны трэнер ГА Беларуская ліга бацькоў і педагогаў "Крок за крокам"

Хочу выразить благодарность всем организаторам и участникам Фестиваля неформального образования.

На мой взгляд, самой сильной стороной Фестиваля была консолидация неравнодушных к проблемам развития гражданственности и демократизации образования людей. Я реально поняла, что есть организации, люди, которые прокладывают свой путь к позитивным переменам в нашем обществе. Презентации, в которых я принимала участие, показали высокий профессионализм и компетентность тренеров. Организация Фестиваля демонстрировала уважение к ценностям демократии: возможность выбора, неформальное общение, свободные высказывания и обсуждения, разные категории участников и т.д. Являясь представителем общественной организации, я понимаю, сколько усилий потребовалось для подготовки...

Надеюсь на дальнейшее сотрудничество!

# Вынікі конкурсу

У межах Фестывалю нефармальнай адукацыі адбыўся конкурс на лепшыя выданні, стэнды і майстар-класы.

Конкурс "Лепшае выданне ў сферы нефармальнай адукацыі" адбываўся па чатырох намінацыях: **"Прывабнасць выдання"**, **"Адукацыйная прыдатнасць"**, **"Навучанне дэмакратыі"**, **"Прызнанне журы"**. У конкурсе ўдзельнічала дваццаць пяць выданняў, што былі папярэдне прадастаўлены ўдзельнікамі Фестывалю. Лепшыя выданні вызначала спецыяльнае журы.

Пераможцаў конкурсу "Лепшы стэнд (экспазіцыя) выставы" вызначалі самі ўдзельнікі Фестывалю. Кожны мог адзначыць (прагаласаваць) адзін са стэндаў, што былі прадстаўлены пад час Фестывалю.

Пераможцаў конкурсу "Лепшы майстар-клас Фестывалю" таксама вызнычылі самі ўдзельнікі, што прымалі непасрэдны ўдзел у тым ці іншым майстар-класе.

## Стэнды арганізацый, заняўшыя прызавыя месцы па выніках галасавання гасцей і ўдзельнікаў Фестывалю

**1.** Фонд развіцця праваых тэхналогій.

**2.** Грамадскае аб'яднанне "Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў «Трэці сектар»".

**3.** Агенцтва гуманітарных тэхналогій і Цэнтр сацыяльных інавацый.

## Выданні — пераможцы конкурсу "Лепшае выданне сферы нефармальнай адукацыі"

### Намінацыя "Прывабнасць выдання"

**1 месца**
Искусство жить в мире с самим собой, с другими, с природой: цикл классных часов для старшеклассников / М.С.Барановская, Е.И. Луговцова, О.М. Савчик. Минск: Новое знание, 2007. 128 с.

**2 месца**
Как воспитать "зеленого" потребителя? Идеи, программы и практики. Методическое пособие / Н. Рябова, И. Ковель. Мн.: ОО "Экодом", 2007.

### Намінацыя "Адукацыйная прыдатнасць"

**1 месца**
Экогруппа: качество жизни, или Как спасти планету, не напрягаясь. Руководство по домашней экологии / под ред. Н. Рябовой и Е. Гончаровой. Мн.: ОО "Экодом", 2007. 78 с.

**2 месца**
Психологическая гостиная для учащейся молодежи: Методические рекомендации / Ю.И. Чепик, С.В. Мицкевич. Мн.: ОО "Фокус-группа", 2008. 65 с.

→

# Вынікі конкурсу

## Намінацыя “Навучанне дэмакратыі”

**Першая прэмія**

Дэмакратыя для ўсіх. Метадычны дапаможнік. / Кузьмініч І., Нікановіч В., Руднік В., Салей С. Гродзенскае абласное грамадскае аб'яднанне маладых навукоўцаў “ВІТ”, Мінск 2006, 54 с.

**Другая прэмія**

Н.Рябова, Т.Новикова. Обучение демократии. В поисках гармонии: образование для устойчивого развития. Мн.: ОО “Экодом”, 2007. 102 с.

## Намінацыя “Прызнанне журы”

Серия книг “Беларусь для начинающих” (АГТ-ЦСИ)

“Становление и развитие сообществ в Беларуси”/ Водолажская Т., Мацкевич В.

“Организационно-деятельностные игры. Популярное введение”/ Водолажская Т., Егоров А.

“Качество и образ жизни в Беларуси: эволюция и возможности трансформации”/ Водолажская Т., Мацкевич В.

“Становлении нации в Беларуси: от подданства к гражданству”/ Водолажская Т., Егоров А., Мацкевич В.

Мировые политические идеологии: классика и современность / В.В. Ровдо, В.Ю. Чернов, А.Н. Казакевич; под общ. ред. В.Ю. Чернова. Минск: Тонпик, 2007. 272 с.










## Майстар–класы, заняўшыя прызавыя месцы на ІІ Фестывалі нефармальнай адукацыі

**1 месца**

**Майстар-клас “Фларыстыка: уводзіны ў прафесію”**

**Вядучыя:** Таццяна Дзянскевіч, Ларыса Мілько
(Клуб фларыстаў пры МГА “Адукацыя без межаў”, Мінск)

**2 месца**

**Майстар-клас “Сваім домам кіруем па-гаспадарску”**

Вядучыя: Ірына Жыхар, Ірына Плаўская
(ГА «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын»)

**3 месца**

**Майстар-клас “Праграма прававой адукацыі моладзі «Права на кожны дзень»”**

**Вядучы:** Ігар Кузьмініч
(ГАГА маладых навукоўцаў “ВІТ”, Гродна)

**Майстар-клас “Гендэрная асвета і грамадзянскія дзеянні”**

**Вядучая:** Людміла Пеціна
(ГА “Жаночы незалежны дэмакратычны рух”, Мінск)

■